УДК: 908

# ПЕРСАНАЖЫ БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІІ ЯК АБ'ЕКТ ГЕАГРАФІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

**В. Р. Раманенка, С. П. Харытонава**

*ДУА «Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» вул. Ульянаўская, 8, 220055, г.Мінск, Беларусь, 20sonashek20@gmail.com, ugorenko@lyceum.by*

Разгледжаны рэгіёны рассялення персанажаў беларускай міфалогіі. Створана класіфікацыя міфалагічных істот Беларусі на падставе іх фізіка-геаграфічных прыкмет. На падставе кнігі «Міфалогія Беларусаў. Энцыклапедычны слоўнік», прааналізаваны сведчанні беларускіх фалькларыстаў, выдзелены асноўныя рэгіёны распаўсюджвання персанажаў беларускай міфалогіі. Сыходзячы з класіфікацыі і рэгіёнаў рассялення кожнага прадстаўніка, распрацаваны электронны дадатак для смартфонаў, рэалізаваны на платформе «.net Maui (c#)» пад андроід. Дадатак складаецца з інтэрактыўнай карты, сістэмы пошуку і сістэматызаваннай інфармацыі пра персанажаў беларускай міфалогіі. Дадатак пашырае доступ да ведаў і забяспечвае лёгкі шлях для атрымання інфармацыі.

***Ключавыя словы***: фальклор; класіфікацыя; электронны дадатак; беларуская міфалогія; міфалагічныя істоты.

# CHARACTERS OF BELARUSIAN MYTHOLOGY AS AN OBJECT OF GEOGRAPHICAL STUDY

**S. R. Romanenka, S. P. Kharytonova**

*Lyceum BSU, Ulyanovskaya Street., 8, 220055, Minsk, Belarus, 20sonashek20@gmail.com, ugorenko@lyceum.by*

The regions of settlement of the characters of Belarusian mythology are considered. A classification of mythological creatures of Belarus has been created based on their physical and geographical features. Based on the book "mythology of Belarusians. Encyclopedic dictionary" the witnesses of Belarusian folklorists are analyzed, the main regions of distribution of the characters of Belarusian mythology are highlighted. Based on the classification and regions of settlement of each representative, an electronic smartphone application has been developed, implemented on the platform.NET Maui (c#) for Android. The application consists of an interactive map, a search system and systematized information about the characters of Belarusian mythology. The app expands access to knowledge and provides an easy way to get information.

***Keywords***: folklore, classification; electronic supplement; Belarusian mythology; mythological creatures.

Мэтай працы з’яўляецца папулярызацыя прадстаўнікоў беларускай міфалогі і распаўсюджванне зацікаўленасці сярод турыстаў на аснове інтарэса да беларускага фальклору.

Задачамі працы з'яўляюцца:

1) даследванне актуальнасці тэмы беларускай міфалогіі;

2) тэарэтычнае разгледжанне прадстаўнікоў беларускай міфалогіі;

3) класіфікацыя персанажаў беларускай міфалогіі па фізіка-геаграфічных прыкметах;

4) картаграфічнае прадстаўленне аб'ектаў беларускай міфалогіі з дапамогай электроннага дадатка.

Аб'ектам даследавання з’яўляюцца міфалагічныя істоты Беларусі.

Для даследавання актуальнасці пытання, праведзена апытанне сярод навучэнцаў, выпускнікоў і выкладчыкаў Ліцэя БДУ — усяго 256 рэспандэнтаў (табліца):

**Вынікі апытання выпускнікоў і выкладчыкаў Ліцэя БДУ**

| | |
|---|---|
| *Пытанне № 1* “Ведаеце вы, хто такія нячысцікі?” | |
| Так | 97,6 % |
| Не | 2.4 % |
| *Пытанне № 2* “Дзе вы калі-небудзь сутыкаліся з ўзгадваннем пра нячысцікаў” | |
| Праз кнігі пра нячысцікаў | 35 % |
| Праз малюнкі | 32 % |
| Праз кінамастацтва | 26 % |
| З музеяў беларускай культуры | 21 % |
| *Пытанне № 3* “Ці чыталі вы калі небудзь народныя казкі, дзе ёсць нячысцікі?” | |
| Так | 82,9 % |
| Не | 17,1 % |
| *Пытанне № 4* “Захапляецеся вы вывучэннем гісторыі Беларусі і яе культуры?” | |
| Так, вельмі | 65, 9% |
| Так, але мінімльна | 29,3 % |
| Не | 4.8 % |
| *Пытанне № 5* “Цікава вам ўсё звязанае з нячысцікамі?” | |
| Так | 85,4 % |
| Нейтральнае стаўленне | 7,3 % |
| Не | 7.3 % |

Такім чынам вызначылася, што больш за 60 % рэспандэнтаў цікавяцца дадзенай тэмай, што сведчыць аб яе дастаткова высокай актуальнасці.

Нячысцікі — гэта міфалагічныя істоты ў беларускім фальклоры. У даўніх вераваннях беларусаў абагульненная назва ўсёй нячыстай сілы, чарцей, злыдняў і іншых істот народнай дэманалогіі. Беларуская міфалогія — сістэма міфаў і ўяўленняў пра навакольны свет, яна ўключае [1, с. 26]:

1) язычніцкую міфалогію балтаў;

2) язычніцкую міфалогію славян;

3) павер'і беларускіх сялян, якія можна сустрэць у вёсках нават сёння.

У 9-8 тысячагоддзях да н.э. калі тэрыторыю Беларусі пачалі засяляць паўднёва-еўрапейцы, існавалі пэўныя міфалагічныя ўяўленні. Развіццё язычніцкай міфалогіі беларусаў як рэгіянальнага варыянта ўсходнеславянскай завяршылася ў дзясятым стагоддзі. З прыходам хрысціянства паганская міфалогія на тэрыторыі Беларусі не знікла, некаторыя элементы дахрысціянскіх вераванняў схаваліся і працягваюць функцыянаваць на бытавым узроўні да нашых дзён. Персанажы беларускай міфалогіі сталі героямі фальклару.

Былі вылучаны дзве асноўныя класіфікацыі аб'ектаў беларускай міфалогіі: Класіфікацыя паводле месца рассялення і стаўлення да чалавека.

Згодна з класіфікацыяй паводле месца рассялення персанажы беларускай міфалогіі падзяляюцца на *палявых, хатніх, водных, лясных і цёмных.* Цёмныя атрымалі сваю назву з-за таго, што з'яўляюцца шкоднымі ў адносінах да насельніцтва. Яны жывуць амаль паўсюль, дзе ёсць людзі, але не абавязкова ў іх хатах. Трэба мець на ўвазе, што больш за ўсё звестак пра цёмных нячысцікаў пастпала з Віцебскай вобласці.

Згодна класіфікацыі паводле стаўлення да чалавека вылучаюць *станоўчых, нейтральных і адмоўных* персанажаў. Нячысцік лічыцца станоўчым, калі ён сам ці яго дзейнасць дапамагаюць чалавеку. Напрыклад, Пячурнік, Дамавы, Спорнік. Нейтральныя нячысцікі могуць мець абыякавае стаўленне да чалавека. Адмоўныя — заўсёды перашкаджаюць чалавеку, намагаюцца зрабіць горш, забіць чалавека, скарыстацца ім. Прыклады — Паралікі, Галышка, Лямец.

Аналізуючы месцы збору сведкаў аб нячысцікаў, былі зроблены некаторыя высновы:

1) месцы распаўсюджання нячысцікаў супадаюць з рэгіённамі, дзе яны граюць важную ролю;

2) водныя нячысцікі распаўсюджаны ў Мядзельскім раёне (Нарачанскія азёры), Браслаўшчыне (Браслаўскія азёры) і Вілейскім раёне (р. Вілія). Гэтыя рэгіёны фарміруюць тэррыторыю, якая больш за ўсё пакрыта воднымі аб'ектамі, а жыццё людзей, іх быт быў цесна звязан з вадой;

3) весткі пра лясных нячысціках больш распаўсюджаны на Віцебшчыне і Міншчыне — месцах большай лясістасці. У Мінскай вобласці знаходзіцца самы вялікі лясны масіў - Налібоцкая пушча. Ёсць асобныя прадстаўнікі, якія жывуць у Белавежскай пушчы(як прыклад — Пушчавік)

У адпаведнасці з з класіфікацыяй па рэгіёнах рассялення прадстаўнікоў беларускай міфалоргіі быў расспрацаваны электронны дадатак для смартфонаў, рэалізаваны на платформе «.net Maui (c#)» пад андроід. Дадатак складаецца з інтэрактыўнай карты, сістэмы пошуку і сістэматызаваннай інфармацыі пра персанажаў беларускай міфалогіі. Дадатак пашырае доступ да ведаў і забяспечвае лёгкі шлях для атрымання інфармацыі (*мал. 1*).

*Мал. 1.* «QR-код» на спасылку (https://t.ly/niacysciki)
для спампавання электроннага дадтку «Нячысцікі»

Прылада мае назву “Нячысцікі”. Яна распрацавана для таго, каб мець канкрэтную і асноўную інфармацыю пра прадстаўнікоў беларускай міфалогіі, якая падаецца ў выглядзе апісання кожнай істоты (мал. 2).

Прылада ўяўляе сабой карту Беларусі з выявамі персанажаў беларускай міфалогіі. Пры націсканні на іконкі персанажаў у дыялогавым вакне з’яўляецца “пашпарт нячысціка”, дзе можна даведацца асноўную інфармацыю: імя, лакалізацыя (вобласць, раён), тып згодна класіфікацыі і г. д. Таксама прылада прадугледжвае радок пошуку, дзе магчыма знайсці міфічную істоту па тэрытарыяльнымаму прызнаку — абраць адпаведную воблаць ці горад або шукаць персанажа ці праглядаць аўтаматычна прапанаваныя варыянты з абранай вобласці ці горада.




*Мал. 2.* Электронны дадатак для смартфонаў«Нячысцікі»,
рэалізаваны на платформе «.net Maui (c#)» пад андроід

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Санько С., Валодзіна Т., Васілевіч У.* Беларуская міфалогія, энцыклапедычны слоўнік // Энцыклапедычны слоўнік. Мінск: Беларусь, 2004. 582 с.

2. *Басак А.* Беларускія нячысцікі : лясныя / Артур Басак пры ўдзеле Аліны Длатоўскай. – Мінск : Тэхналогія, 2022. – 67 с.

3. *Шпилевский П. М.,* Фольклорное наследие белорусов. Обряды. Поверья / сост. и автор предисл. Александр Ващенко. Минск : Беларусь, 2020. 343 с.

4. Беларускі фальклор : Матэрыялы і даследаванні. Зборнік навуковых прац. Вып. 1. Мінск : Беларуская навука , 2014. 464 с.

5. Беларускі фальклор : Матэрыялы і даследаванні. Зборнік навуковых прац. Вып. 2. Мінск : Беларуская навука , 2014. 528 с.